*Унікальны выпадак: некалькі святочных падзей адбываюцца практычна адначасова. У гэтым годзе наш часопіс адзначае 10-гадовы юбілей. Знамянальнай даце будзе прысвечаны наступны нумар. Споўнілася 75 гадоў Людміле Ціханаўне Спірыдонавай і Іне Васільеўне Смяян – людзям, што стаялі ля вытокаў заснавання часопіса і на працягу многіх гадоў стваралі «Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў».*

*Прафесар кафедры культуралогіі Пётр Рыгоравіч Ігнатовіч, якому прысвячаецца ніжэйпададзены артыкул, таксама адзначае юбілей.*

*Віншуем юбіляраў са знамянальнай падзеяй! Жадаем здароўя, добрага настрою, цеплыні і ўтульнасці!*

## АДДАНЫ НАВУЦЫ АБ КУЛЬТУРЫ
## (да 75-годдзя з дня нараджэння прафесара П. Р. Ігнатовіча)



Пётр Рыгоравіч Ігнатовіч належыць да тых асоб, якія прысвяцілі жыццё служэнню духоўнай культуры. Абраўшы цярністы шлях сацыёлага культуры, ён ніколі не пашкадаваў аб гэтым. Жыццё будучага навукоўцы пачыналася ў «выбуховы», «ракавы» 1937 год. Ішло жніво, якога заўсёды з нецярплівасцю чакалі. Але яшчэ раней пачалося іншае «жніво»: трагічнае, спусташальнае. Касілі генафонд беларускай нацыі, «чорныя варанкі» здзёўбвалі залатыя зярняты нацыі. Груганы абмінулі сям'ю Рыгора. Магчыма, сыграла ролю шчаслівая лічба «7». Бацька нарадзіўся ў 1907 г., Пятрусь – у 1937, сястра Ганна – у 1947. 25 ліпеня, калі з'явіўся на свет Пятрусь, у суме таксама дае лічбу 7. Няпроста ў той час жылося шматдзетнай сялянскай сям'і (у бацькоў было пяцёра дзяцей). Выручала майстэрства бацькі, які выдатна засвоіў шавецкую справу.

У дзяцінстве Пятрусь праяўляў павышаную цікавасць да кнігі, незвычайных апавяданняў бацькі і яго кліентаў з навакольных вёсак, своеасаблівай вуснай народнай творчасці. Бацькі заўважылі нязвыклую прагу хлапчука да ведаў і вырашылі падтрымаць яго ў гэтым імкненні. У вёсцы Цярэсіна Бярэзінскага раёна былога Ігуменскага павета, дзе нарадзіўся Пятрусь, пачатковую школу размясцілі ў некалькіх сялянскіх хатах, якія ўцалелі пасля вайны. Вось у гэтую школу і адправілі бацькі сямігадовага Петруся. Каб навука ішла нятуга, не патрэбна была бацькава папруга. На экзаменах, якія пачынаючы з 4 класа неабходна было здаваць штогод, Пятрусь атрымліваў выдатныя адзнакі. У выніку сямігодка ў 1952 г. была скончана юнаком з адзнакай. Цяпер для Петруся Ігнатовіча адкрываліся неабсяжныя далягляды. Выбар быў зроблены раней. У школе працавалі таленавітыя, адданыя педагагічнай дзейнасці настаўнікі, сапраўдныя інтэлігенты, якія былі ўзорам для многіх вясковых дзяцей. Юнак таксама імкнуўся быць падобным да іх, прысвяціць сваё жыццё пошукам ведаў. Тым больш, што такіх поглядаў прытрымліваўся і яго дваюрадны брат Алесь Ігнатовіч. Атрымаўшы атэстаты, хлопцы вырашылі разам паступаць у Мінскае педвучылішча імя Н. Крупскай. Было крыху страшнавата. Мінск з невялічкай лясной вёсачкі, якая прытулілася «паміж пустак балот беларускай зямлі…», падаваўся іншым светам. Але маладосці ўсё пад сілу: 130 кіламетраў ад роднай вёскі, незнаёмы вялікі горад не стрымлівалі хлопцаў.

Уступныя іспыты праводзіў асабіста дырэктар вучылішча, Герой Савецкага Саюза У. А. Парахневіч. Як выдатніка Пятра прымалі без уступных экзаменаў, але Уладзімір Аляксеевіч вырашыў правесці з выдатнікамі размову. Хлопец адразу спадабаўся педагогу. Паміж навучэнцам і педагогам усталявалася своеасаблівае сяброўства. Нярэдка дырэктар вучылішча гуляў з Пятром у шахматы, распавядаў пра партызанскае жыццё. Гэтыя сустрэчы запалі ў сэрца юнаку на ўсё жыццё. Студэнцкія гады прынеслі шмат цікавых знаёмстваў з таленавітымі хлопцамі і дзяўчатамі, якія пазней стануць славутымі дзеячамі беларускай навукі, мастацтва. У педвучылішчы ў гэты час на розных курсах вучыліся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Н. Гілевіч (народны паэт Беларусі), А. В. Сабалеўскі (доктар мастацтвазнаўства), А. І. Марэцкі (кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, дэкан факультэта завочнага навучання Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў), М. Герчык (пісьменнік).

Вучоба, як і ў школе, ішла спорна, хапала часу на грамадскую дзейнасць. Асабліва вабіла юнака мастацкая самадзейнасць, ён з задавальненнем наведваў аркестр народных інструментаў. Аб’ездзіў з аркестрам амаль усю Міншчыну, некалькі музычных твораў у выкананні аркестра запісала беларускае радыё. Не чураўся хлопец і спорту, меў пэўныя разрады па валейболе, лёгкай атлетыцы.



З 1956 г. пачынаецца самастойная навукова-педагагагічная і грамадская дзейнасць. Спачатку маладога настаўніка накіравалі ў Чэрвеньскі раён, дзе непадалёку жылі бацькі, і хлопец імкнуўся нейкім чынам ім дапамагаць. Тры гады настаўнічаў у сельскай школе, педагагічную працу спалучаў з грамадскай дзейнасцю. Моладзь Чэрвеньшчыны заўважыла няўрымслівага, эрудзіраванага маладога настаўніка і на раённай канферэнцыі абрала сваім лідарам. Пазней Пётр Рыгоравіч прызначаецца раённымі ўладамі на пасаду загадчыка аддзела культуры. Менавіта на гэтай пасадзе праявіліся яго арганізацыйныя і навуковыя здольнасці. Дзесяць гадоў ён шчыраваў на ніве культуры, шмат зрабіў для ўмацавання матэрыяльнай базы ўстаноў культуры, пошуку таленавітых выканаўцаў-аматараў, вывучэння культурнай спадчыны. Дзякуючы яму былі выяўлены беларускія карані С. Манюшкі, створаны музей кампазітара. Значную дапамогу аказаў загадчык аддзела славутаму Натальеўскаму хору, якому ў 60-х гг. мінулага стагоддзя было нададзена званне «народнага». Паспрыяў Пётр Рыгоравіч стварэнню і пераўтварэнню ў «народны» знакамітаму ансамблю дудароў пад мастацкім кіраўніцтвам самародка Івана Лычкоўскага. Нямала ён папрацаваў над пашырэннем раённай бібліятэчнай і клубнай сеткі.

За клопатамі аб развіцці культуры раёна не забывалася мара аб вышэйшай адукацыі. Юнак паступае на завочнае аддзяленне гістарычнага факультэта, якое паспяхова заканчвае ў 1965 г. У перыяд вучобы ва ўніверсітэце праявілася схільнасць да даследчай дзейнасці, яго кантрольныя і курсавыя працы насілі індывідуальны творчы характар. Выкладчыкі раілі не пакідаць даследчай дзейнасці, падумаць аб вучобе ў аспірантуры. У той жа час шкада было развітвацца з раёнам, да людзей якога прыкіпеў усёй душой. І ўсё ж прага да навуковай дзейнасці перамагла.

У 1971 г. Пётр Ігнатовіч вытрымлівае конкурс і залічваецца ў дзённую аспірантуру Беларускага інстытута народнай гаспадаркі. Па выніках дысертацыйнага даследавання яму прысвойваецца вучоная ступень кандыдата гістарычных навук. Малады навуковец застаецца на педагагічнай працы ў гэтай ВНУ.

У сярэдзіне 70-х гг. XX ст. у Беларусі ствараецца Мінскі інстытут культуры, якому патрэбны кадры, што добра ведаюць айчынную культуру. Кандыдатура Пятра Рыгоравіча як найлепей адпавядае профілю інстытута. У 1981 г. ён пераходзіць у інстытут культуры, які ў 1993 г. пасля дзяржаўнай атэстацыі становіцца ўніверсітэтам культуры. Два дзясяткі гадоў Пётр Рыгоравіч з’яўляецца загадчыкам кафедры. З развіццём беларускай прыкладной сацыялогіі ён праяўляе інтарэс да гэтай галіны гуманітарных ведаў. Уваходзіць у шэраг сацыялагічных груп, якія даследуюць аспекты сацыяльнага развіцця розных працоўных калектываў. Асабліва плённых поспехаў дасягнулі сацыялагічныя групы, якія ўзначальваў П. Р. Ігнатовіч, пры даследаванні калектываў Асіповіцкага кардонна-рубероідавага завода і Маладзечанскага завода сілавых паўправадніковых вентыляў. У склад групы ўваходзілі вядомыя сёння навукоўцы-сацыёлагі, дактары сацыялагічных навук А. У. Рубанаў і С. А. Шавель. Даследчыкі прапанавалі калектывам шэраг эфектыўных рэкамендацый па паляпшэнні маральна-псіхалагічнага клімату на прадпрыемствах, падборы кадраў. Вынікі навуковай дзейнасці былі абагульнены і апублікаваны.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Шмат намаганняў прыклаў прафесар П. Р. Ігнатовіч для ўкаранення ў навучальны працэс такой вучэбнай дысцыпліны, як «Сацыялогія». Ён актыўна працуе ў аўтарскім калектыве па распрацоўцы тыпавой праграмы па сацыялогіі, займаецца падрыхтоўкай да выдання вучэбнай праграмы па дадзенай дысцыпліне для студэнтаў БДУ культуры і мастацтваў. Піша і выдае арыгінальны аўтарскі падручнік на беларускай мове па сацыялогіі, які карыстаецца попытам у студэнтаў. Прымае актыўны ўдзел у навуковым жыцці сацыялагічнага таварыства Рэспублікі Беларусь. Ён пастаянна ўдзельнічае ў экспертызе і кансультаванні разнастайных сацыялагічных праектаў, якія ажыццяўляюцца беларускімі вучонымі.

Яскрава талент П. Р. Ігнатовіча праявіўся ў перыяд станаўлення і развіцця беларускай культуралогіі. Ён узначаліў адну з першых у Беларусі кафедру культуралогіі, быў у вытокаў аспірантуры і дактарантуры па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры». Пад яго навуковым кіраўніцтвам сфарміравалася плеяда айчынных культуролагаў, якія працуюць у шэрагу ВНУ. Так, былы аспірант Пятра Рыгоравіча С. Л. Вілейка ўзначальвае кафедру культуралогіі ў ГрДУ імя Я. Купалы, Н. Я. Шалупенка – дэкан факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва БДУ культуры і мастацтваў, А. І. Сцепанцоў загадвае кафедрай менеджменту сацыякультурнай дзейнасці. Прафесар П. Р. Ігнатовіч і сёння працягвае шчодра дзяліцца сваім навукова-педагагічным вопытам з маладымі даследчыкамі: ажыццяўляе плённае навуковае кіраўніцтва магістрантамі і аспірантамі. С. А. Пацыенка, якая пад яго кіраўніцтвам у 2011 г. паспяхова абараніла дысертацыю, сведчыць: «Пётр Рыгоравіч вельмі дэмакратычны кіраўнік – ён уважліва прыслухоўваецца да думкі магістранта ці аспіранта, лічыць, што пункт погляду маладых калег заслугоўвае павагі». Аўтарская педагогіка супрацоўніцтва прафесара П. Р. Ігнатовіча была заўважана грамадскасцю краіны. У 1999 г. педагог стаў лаўрэатам прэміі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, за выдатныя поспехі ў развіцці вышэйшай адукацыі ў 2002/2003 навучальным годзе ўдастоены персанальнай надбаўкі.

Пётр Рыгоравіч умела спалучае педагагічную і навуковую дзейнасць. За час працы ў БДУ культуры і мастацтваў ім апублікавана звыш 150 навуковых прац. Ён з'яўляецца адным з аўтараў шэрагу калектыўных манаграфій, у тым ліку «Этнічныя асновы культуры» (П. Р. Ігнатовіч, Ю. В. Чарняўская); адным з рэдактараў навуковых зборнікаў: «Культура Беларусі: стан і перспектывы развіцця», «Гісторыка-культурная спадчына Камянеччыны». Прафесар П. Р. Ігнатовіч працягвае даследаванне шэрагу праблем дынамікі беларускай культуры, у прыватнасці адметнасцей трансфармацыйных працэсаў у сацыякультурнай сферы, месца і ролі этнічных супольнасцей у культуратворчай дзейнасці суб'ектаў айчыннай культуры. Яго даклады на навуковых канферэнцыях выклікаюць у калег пазітыўны водгук, актыўныя дыскусіі.

Пятру Рыгоравічу ўласціва актыўная дзейнасць і ў паўсядзённым жыцці. У пэўным сэнсе яго можна лічыць «фанатам» футбола, хакея і шахмат. На ўніверсітэцкіх днях здароў'я прафесар заўсёды па шахматах займае прызавыя месцы. Любіць ён у вольны час паблукаць па лесе, наведаць толькі яму вядомыя грыбныя мясціны, нарэзаць кошык-другі баравікоў. Утульна адчувае яго госць і на Ігнатовічавым лецішчы: там і лазня, і юшка, і келіх віна з уласнага вінаградніку. Пачуеш ад прафесара і цікавы аповяд аб асобных эпізодах з яго жыцця і знакамітых людзей краіны і свету, калі-нікалі трапны анекдот, дасціпны жарт, шчырую песню.

Вобраз Пятра Рыгоравіча быў бы няпоўны без аповяда пра самых блізкіх і дарагіх яму людзей. Вернай спадарожніцай на яго няпростых жыццёвых пуцявінах была каханая жонка Галіна Сцяпанаўна, якая нарадзіла і выхавала дзвюх дачок.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Пётр Рыгоравіч ганарыцца тым, што яго дзеці і ўнукі працягваюць сямейныя традыцыі, у тым ліку і прафесійныя. Дачка Наталля Пятроўна – старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра сацыяльна-палітычных даследаванняў БДУ. Унучка Аляксандра таксама прафесійны сацыёлаг – выкладчык ВНУ, скончыла аспірантуру па спецыяльнасці «сацыялогія». Дачка Тамара Пятроўна – дасведчаны бухгалтар-эканаміст. Малодшыя ўнук і ўнучка – студэнты ВНУ. Расце праўнучка, якая, дарэчы, нарадзілася роўна праз сто гадоў пасля нараджэння сваёй прапрабабулі Вольгі Максімаўны – матулі Пятра Рыгоравіча, у Дзень Нараджэння Хрыстова 7 студзеня. Такая цікавая нумаралогія.

Юбілейны ліпень прафесар П. Р. Ігнатовіч сустракае з добрымі навуковымі і педагагічнымі здабыткамі, з марамі і клопатамі аб далейшым развіцці айчыннай культуралогіі. Пажадаем гэтай шчырай, спагадлівай асобе здароў'я, прыхільнасці лёсу, натхнення, сонечнага святла і цеплыні!

*А. І. Смолік, доктар культуралогіі, прафесар*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ